**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2018 г.

## <u>Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры «Маіх радкоў няма без Беларусі»</u>

**11 лістапада**

У бібліятэцы прайшла літаратурная сустрэча «Роднай мовы пералівы» з удзелам членаў літаратурнага аб'яднання «Белы бусел». Кіраўнік аматарскага аб'яднання Галіна Балахоўская прадставіла цыкл вершаў «Прагне душа чысціні». Са сваімі творамі выступілі Наталля Сацута і Надзея Момлік, з песнямі пад гітару - Мікалай Крывагуз і Галіна Кузіч. У завяршэнні мерапрыемства Наталля Сацута прадставіла зборнік вершаў «Рамонкавы пах», а Надзея Паўзун прачытала свае вершы.

Астроміцкая ПБ, 25 чал.

**14 лістапада**

У час правядзення Дня беларускай паэзіі «Вершы сінявокай зямлі» наведвальнікам прадстаўлены зборнікі вершаў беларускіх паэтаў. Юныя чытачы з задавальненнем прыгадвалі свае любімыя вершы на беларускай мове і дэкламавалі некаторыя на памяць. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з правіламі вершаскладання, а яны паспрабавалі самастойна выканаць літаратурныя заданні. Дзеці ўдзельнічалі ў віктарыне «Любімыя вершы з любімых кніг».

Гарадзецкі філіял, 28 чал.

**19 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшло выступленне літаратурна-паэтычнай групы «Рытм» «А ўсё таму, што родам з лістападу…», прысвечанае 70-годдзю з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц. Бібліятэкары пазнаёмілі вучняў СШ № 3 г. Кобрына з біяграфіяй Яўгеніі Іосіфаўны, расказалі пра яе творчасць. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Пачынаецца ўсё з любові…».

ЦРБ, 32 чал.

**21 лістапада**

Удзел у літаратурнай вечарыне «Шчаслівай долю назаві…», прысвечанай жыццю і творчасці заслужанай дзеячкі мастацтваў Беларусі, выбітнай беларускай паэткі і перакладчыцы Ніны Мацяш, прынялі вучні старэйшых класаў СШ № 3 г. Кобрына. Вядучыя разам з прысутнымі прагарталі старонкі біяграфіі паэткі, пагаварылі аб незвычайным літаратурным таленце Ніны Мацяш. Закончылася вечарына віктарынай «Мы ўсе з любові ды сяброўства».

ЦРБ, 36 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках абласной прафілактычнай акцыі «Карысныя канікулы»**

**1 лістапада**

Навучэнцы малодшых класаў Батчынскай сярэдняй школы сталі ўдзельнікамі тэатралізаванага свята «Осень золотая», які падрыхтавалі работнікі бібліятэкі і Дома культуры. Школьнікі ўспомнілі восеньскія прыкметы, прыказкі, прымаўкі, загадкі, атрымваючы за кожны слушны адказ садавіну ці агародніну з кошыка. Увагу дзяцей прыцягнула кніжная выстава «Под книжным дождем» і выстава малюнкаў «Краски осени». У завяршэнні свята ўсе ўдзельнікі атрымалі салодкія прызы.

Батчынская ПБ, 80 чал.

**6 лістапада**

На пасяджэнні гісторыка-краязнаўчай секцыі клуба «Універсітэт залатога ўзросту", прысвечаным гісторыі вуліцы Пралетарская г. Кобрына, выступілі навучэнцы старэйшых класаў СШ № 3, якія пазнаёмілі прысутных са сваімі даследаваннямі па гэтай тэме. Дадаткова члены клуба разгледзелі пытанні планавання на 2020 год.

ЦРБ, 35 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Всемирный день некурения»**

**21 лістапада**

У час правядзення маральна-этычнага ўроку «За мир без табачного дыма!» бібліятэкары пазнаёмілі навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа з цікавымі фактамі аб знакамітых людзях (пісьменніках, акцёрах, музыкантах), якія не адмовіліся ад курэння і ў выніку паплаціліся за гэта жыццём. Медыцынскія аспекты згубнага ўплыву на арганізм чалавека і важнасці здаровага ладу жыцця асвятліла ўрач-валеолаг Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева. З расказа святара Свята-Петра-Паўлаўскай царквы айца Сергія хлопцы даведаліся, чаму курэнне лічыцца грахом. Суправаджалася мерапрыемства паказам відэапрэзентацыі «Выбираем жизнь без сигарет».

ЦРБ, 72 чал.

**28 лістапада**

Для навучэнцаў 6 – 8 класаў Кіселявецкай СШ у рамках праекта «Кніга ў кадры» сумесна з кінатэатрам «Вясёлка» адбыўся ўрок здароўя «Курение – правда и заблуждения». Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі навучэнцам пра негатыўныя наступствы гэтай згубнай звычкі і як можна памяняць свой лад жыцця. Завяршылася мерапрыемства праглядам фільма «Остановись!».

Кіселявецкая ПБ, 32 чал.

**29 лістапада**

На прафілактычнай гадзіне «Дышу легко, дышу свободно» бібліятэкары расказалі прысутным пра гісторыю тытуню і мерах, якія прымаюцца ў розных краінах для барацьбы з гэтым сусветным бедствам.

Урач-валеолаг Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева расказала аб наступствах для здароўя, звязаных з курэннем. У канцы мерапрыемства яго ўдзельнікі мелі магчымасць паглядзець фільм «Остановись!».

Буховіцкая ПБ, 37 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**18 лістапада**

Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка далучылася да міжнароднага праекта «Тыдзень літаратуры краін Паўночнай Еўропы», арганізаванага Канфедэрацыяй Паўночных Асацыяцый. Віктарыны і чытанні ўслых для дзяцей прайшлі ў 5, 9 – 11 класах СШ № 7 г. Кобрына, для дарослых – у цэнтральнай раённай бібліятэцы. За актыўны ўдзел у міжнародным праекце Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ўзнагароджана дыпломам Цэнтра шведскіх даследванняў.

144 чал.

**18 лістапада**

Вакальны гурт «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай бібліятэкі і літаратурны клуб «ПоэтиКо» паднеслі жыхарам Кобрынскага раёна святочны падарунак – канцэрты на выбарчых пляцоўках.

**18 лістапада**

Чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прайшло ў фармаце літаратурнай лабараторыі «Укрощение ошибок». Падчас літаратурнага ўрока кобрынскія паэты вывучалі рытм як грунт паэзіі і на практыцы вучыліся знаходзіць і выпраўляць парушэнні рытму ва ўласных вершах.

ЦРБ, 12 чал.

**22 лістапада**

Сумесны семінар-практыкум для бібліятэчных і клубных работнікаў «На пути к профессиональному росту» прайшоў у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры. Лекцыю на тэму тэхнікі і культуры мовы прачытала вядучы метадыст-менеджар Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра Галіна Гурінчук. Выступленні загадчыка аўтаклуба «Традыцыі вырабу і выкарыстання ўбору лелікаўскай свахі», метадыста Кобрынскай раённай клубнай сістэмы, загадчыцы Яромічскага дашкольнага цэнтру развіцця дзіцяці выклікалі інтарэс у прысутных. З актуальнымі і эфектыўнымі метадамі планавання дзейнасці ўстаноў культуры пазнаёміла калег загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

ЦРБ, 60 чал.

**26 лістапада**

Літаратурна-музычная кампазіцыя «Рыжая осень бродит по свету», падрыхтаваная «Універсітэтам залатога ўзросту», які працуе на базе

цэнтральнай раённай бібліяэкі ў рамках праекта «Хобі-цэнтр 55+», сабрала шмат гледачоў. Гасцямі мерапрыемства сталі кобрынскія паэтэсы: член Міжнароднага саюза пісьменнікаў «Новый современник», кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук і член літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Марына Міхалюк.

ЦБ, 55 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81